Тэст № 3

1. Адзначце, якую функцыю выконвае апостраф у беларускай мове:

1) дапамагае раздзельна вымаўляць прыстаўкі, што заканчваюцца на зычную, і кораня, што пачынаецца з галосных *е, ё, ю, я* або націскной галоснай *і*;
2) дапамагае злітна вымаўляць шыпячыя *ж, дж, ч, ш* з наступнымі галоснымі *е, ё, ю, я, і*;
3) дапамагае злітна вымаўляць спалучэнні галосных у іншамоўных словах;
4) дапамагае раздзельна вымаўляць губныя *б, п, в, ф, м* з наступнымі галоснымі *е, ё, ю, я* і націскным *і*;
5) дапамагае размяжоўваць часткі слоў і асобныя словы.

2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца раздзяляльны мяккі знак:

1) шампін...ён; 2) п...яўка; 3) мыш...; 4) Н...ю-Ёрк; 5) ледз...ве.

3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца апостраф:

1) двукроп...е; 2) Мар...яна; 3) здароў...е; 4) раз...езд; 5) павіл...ён.

4. Запішыце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца змякчальны мяккі знак:

1) паштал...ён; 2) дз...ве; 3) бур...ян; 4) мен...шы; 5) чэрвен...скі.

5. Адзначце словы, напісаныя правільна:

1) штосьці; 2) нянчыць; 3) Дзьмітрый; 4) ралля; 5) астрахан'ск

6. Адзначце словы, напісаныя няправільна:

1) трох'ярусны; 2) іньекцыя; 3) біл'ярд; 4) раз'юшаны; 5) Дзям'ян.

7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца ь:

1) талон...чык; 2) ц...вік; 3) мадэл...ер; 4) дзе-небудз...; 5) маленъ...кі.

8. Адзначце памылковыя сцвярджэнні:

1) мяккі знак пішацца пасля шыпячых *ж, дж, ч, ш*;
2) мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных у дзеясловах загаднага ладу перад канчаткам першай асобы множнага ліку *-ма*;
3) мяккі знак не пішацца для абазначэння на пісьме мяккасці *л* перад зычнымі;
4) мяккі знак пішацца пасля *з, л, н, с, ц* (з мяккага *т*), *дз* (з мяккага *д*) для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад цвёрдым зычным;
5) мяккі знак пішацца ў некаторых складаных лічэбніках.

9. Адзначце словы, у беларускамоўных адпаведніках якіх пішацца апостраф:

1) пьеса; 2) льёт; 3) адъютант; 4) воробьи; 5) барьер.

10. Адзначце словы, у беларускамоўных адпаведніках якіх пішацца ь:

1) букварь; 2) поздний; 3) батальон; 4) четырьмя; 5) миллиард.

11. Адзначце формы іменных часцін мовы, у якіх на месцы пропуску пішацца змякчальны мяккі знак:

1) людз…мі; 2) вясел…ле; 3) стан…ма; 4) камен…чыкі; 5) малюпасен…кага.

12. Запішыце слова, у якім на месцы пропуску пішацца апостраф:

1) шчаў…е; 2) куп…істы; 3) Іл…іч; 4) подз…віг; 5) восен…скі.

13. Адзначце формы дзеясловаў, у якіх на месцы пропуску пішацца змякчальны мяккі знак:

1) ляж…ма; 2) хтос…ці; 3) пасун…це; 4) сем…сот; 5) намыл…ся.

14. Адзначце памылковыя сцвярджэнні:

1) мяккі знак пішацца ў назоўніках перад суфіксам *-чык-*, калі зыходнае слова не заканчвалася на *н'*;
2) мяккі знак пішацца пры асіміляцыйнай мяккасці;
3) мяккі знак пішацца ў словах *меньшы, іньшы*;
4) мяккі знак не пішацца паміж падоўжанымі зычнымі;
5) мяккі знак пішацца перад суфіксам *-ск-* у прыметніках, утвораных ад назваў месцаў, якія заканчваюцца на *н'*.

15. Адзначце словы, напісаныя правільна:

1) медальён; 2) зьвілісты; 3) рашэньне; 3) вазончык; 5) які-небудзь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ